# Прэса на памежжы

Няўдачай скончылася сустрэча прадстаўнікоў рэдакцыяў газэт, што выходзяць у нашым рэгіёне, арганізаваная прафэсарам Анджэем Садоўскім у рамках ягонага сэмінару. На маю думку, няўдача гэтая мае дзьве прычыны.

Першая заключаецца ў самым спосабе правядзеньня сэмінару. Не хапіла ўводнага дакладу, які прадстаўляў бы вынікі дасьледаваньняў беластоцкай прэсы адносна прысутнасьці ў ёй этнічнай і рэлігійнай праблематыкі ды ўспрыманьня яе чытачамі. Не замясьціла яго надта ж агульнае ўводнае слова прафэсара А. Садоўскага.

Другой прычынай зьяўляюцца адносіны да згаданай праблематыкі саміх журналістаў, зь якіх частка выказвалася за абавязак уплываньня на чытача, а другая рэзка падобныя думкі адкідвала. Самы скрайні погляд выказаў рэдактар Ян Анішчук з "*Kuriera Porannego*"*. Паводле яго, цяперашняя прэса, як камэрцыйная, мае зарабляць грошы. Такім чынам, яна мусіць адлюстроўваць зацікаўленасьць тых, хто яе купляе, а справы памежжа цікавяць людзей толькі тады, калі выбухае канфлікт. Крыху інакш спрабаваў апраўдаць адсутнасьць згаданай тэматыкі на калёнках тутэйшых газэт галоўны рэдактар "*Gazety Współczesnej*" К. Палінскі. На ягоны погляд, так мала людзей чытае газэты, што яны ніяк ня могуць уплываць на грамадзтва і хопіць, калі зьмяшчаюць аб'ектыўную інфармацыю.

Так ці інакш, пра праблемы памежжа (значыцца, пра нас) газэты наагул ня пішуць. Вэтэран беластоцкае журналістыкі, рэдактар Мар'ян Вісьнеўскі заўважыў, што ў часы ПНР праблематыка памежжа не выступала, бо беларускай і праваслаўнай тэматыкі ўлады баяліся. На кожны артыкул на гэтую тэму патрэбны быў дазвол недзе зьверху. Сёньня дазволу быццам і ня трэба, але этнічная праблематыка надалей адсутнічае на старонках тутэйшага друку. Пішуць толькі пра татараў, бо іх мала.

Паколькі адказаў на дакор, што газэты пра згаданыя праблемы ня пішуць, практычна не было, дазволю сабе некалькі заўваг.

Многія прысутныя сьцьвярджалі, што, жывучы ў Беластоку, яны зусім не адчуваюць, каб жылі на нейкім памежжы. Для іх Беласток — гэта самы звычайны польскі горад, і такім ён зьяўляецца штодзень на калёнках тутэйшага друку. Раз у год недзе нешта трэсьне, і тады толькі заўважаюць, што тут жывуць і іншыя.

Думаю, няма сэнсу дакараць у гэтым журналістаў. Яны такія, як грамадзтва, якое іх выдала. А тутэйшае грамадзтва пра ніякае памежжа чуць ня хоча. Адзін мой знаёмы журналіст пачаў крыху палахліва ставіцца да беларускіх тэмаў з таго часу, як швагер пагрозьліва спытаўся ў яго за сямейным сталом: "*A co ty tak często o tych Białorusinach piszesz?*"**

Тутэйшы паляк, праўда, зусім іншы, чымсьці, скажам, галіцыянін. І нават, падхмяліўшыся, "рускую" песьню запяе. Але гэта ўсё.

Сапраўды, на памежжы жывуць толькі беларусы. Мы, хаця б і не хацелі, мусім ведаць польскую мову. Такім чынам, уся праблематыка памежжа зводзіцца практычна да асыміляцыі беларусаў.

Нашае тут сужыцьцё з палякамі можна вобразна прадставіць неяк так: жывем у адным памяшканьні, але разьдзеленым спэцыяльнай шыбай, празь якую відаць толькі з аднаго боку. Мы іх бачым, яны нас ня бачаць, і нават іх не цікавіць, каб заглянуць на той бок.

Усё–такі нельга вінаваціць ва ўсім толькі палякаў. Яны ж бачаць, як тутэйшы праваслаўны народ прэ ў палякі, дык маюць права думаць, што ў нас нічога цікавага проста няма.

*Друкуецца паводле:*
Ніва. 1994. 5 чэрвеня. № 23. С. 4.

---

* "*Kurier Poranny*" ("Ранішні кур'ер") — штодзённае інфармацыйнае выданьне паўночна-ўсходняга рэгіёну Польшчы, выдаванае са студзеня 1990 г. у Беластоку. — **Рэд.**

** "А што ты так часта пра гэтых беларусаў пішаш?" (пол.). — **Рэд.**